# БЛІСКАВІЦА Ў ДЫЯМЭНЦЕ

Вайна за скрадзенае мінулае пачалася на хвалях «Свабоды» ў самы першы дзень беларускага этэру, 20 траўня 1954 году. Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Янка Запруднік, Паўла Ўрбан, Уладзімер Дудзіцкі, Уладзімер Цьвірка, Масей Сяднёў, Вітаўт Кіпель... Эстафэту гістарычнай зоркі «Свабоды» 1970—1980-х гадоў, Язэпа Барэйкі, перанялі ў другой палове 1990-х два ягоныя маладыя слухачы — Вінцук Вячорка й Вячаслаў Ракіцкі. Іхная перадача «Неабжытая спадчына» гучала да канца XX стагодзьдзя.

Новае тысячагодзьдзе пачала перадача «Беларуская Атлянтыда». Адзін з разьдзелаў кнігі называецца «Настальгія па страчаным моры». Міты й рэаліі эўрапейскай нацыі, якія адкрыліся ў глыбіні мінуўшчыны Вячаславу Ракіцкаму й ягоным спадарожнікам, агаломшваюць, як агаломшвае чалавека першая ў жыцьці сустрэча з морам.

Людзі — рыцары, будаўнікі, фальшываманэтчыкі, чараўнікі, магнаты...
Норавы — забавы, свары, бойкі, авантуры, сэкс...
Ежа — клёцкі, селядзец, гарэлка, гарбата, сыр...
Ваколіцы — лябірынты, мястэчкі, муры, балоты...
Дзяржава — харугвы, канстытуцыі, інтрыгі, войны, калёніі...
Сусьвет — Бог, чорт, рай, пекла, белая магія...

Бясконцы далягляд, велізарнае неба, бяздонныя глыбіні, рух хваляў часу й нясьцерпнае зьзяньне кожнай самай малой пясчынкі як выбух бліскавіцы ў сярэдзіне дыямэнту. І — свойская мяккая хваля, якая люляе й цягне за сабой.

Так пра айчынную гісторыю яшчэ не гаварылі.

*Аляксандар Лукашук,*
*Радыё Свабода*



KAMUNIKAT.ORG